


*9-МАЯ -- 55-я ГАДАВІНА ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ.*

**Павел МОЖАЙСКИЙ,**
**ветеран ВОВ, сотрудник**
**университета**

### САЛЮТ ПОБЕДЫ

*Май отцветал.*
*Дул ветер с Эльбы,*
*Звучали трели соловья.*
*В тот день умолкли всюду*
*стрельбы,*
*Война устала, – думал я.*
*А в полночь радио сообщило:*
*– Войне конец!*
*И сразу тут*
*Пальба в зенит, что мочи было,*
*Победе дал солдат салют.*
*Винтовки били, автоматы*
*Пускали трассы ярких пуль.*
*У дуба танк подслеповатый*
*Из огнемета вверх пальнул.*
*Куда ни глянь – летят ракеты,*
*Огни прожекторов снуют.*
*Салют продлился до рассвета–*
*Неповторим был тот салют!*
*Бурлило небо, в дым одето,*
*Тайфун солдатский не стихал.*
*Как мы встречали День Победы,*
*Не передать того в стихах.*
*Пусть время камни в пыль*
*источит,*
*Столетья новые грядут,*
*Но не забыть той майской ночи,*
*Победный боевой салют!*

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



№ 8(982) | ПЯТНІЦА, 5 мая 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## СВЯТА СА СЛЯЗАМІ НА ВАЧАХ...

У маі мы ўрачыста адзначым знамянальную дату — Дзень Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.

Краіна Саветаў стала галоўнай сілай, якая перагарадзіла шлях германскаму фашызму да сусветнага панавання. Яна вынесла на сваіх плячах асноўны цяжар вайны і адыграла рашаючую ролю ў разгроме гітлераўскай Германіі з яе сатэлітамі і мілітарысцкай Японіяй.

У першых радах абаронцаў Радзімы ішлі камуністы. Яны з'явіліся галоўнай сілай на ўсіх участках барацьбы з ворагам: і ў радах Чырвонай Арміі, у партызанскім і падпольным руху на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі краіны, у працоўных калектывах горада і вёскі, забяспечваючых сваю армію ўсім неабходным для перамогі.

Разам з іншымі народамі Саюза вялікі подзвіг здзейсніў і беларускі народ. Звыш мільёна беларусаў ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Яны ўдзельнічалі ў барацьбе з ворагам з першага да апошняга яе дня, былі актыўнымі ўдзельнікамі бітваў пад Масквой і Ленінградам, Сталінградам, Курскам і Арлом, пры вызваленні Украіны і Прыбалтыкі, Каўказа і Крыма, у Беларускай наступальнай аперацыі, у завяршальных бітвах вайны.

Вялікую дапамогу Чырвонай Арміі аказвала і насельніцтва часова акупіраванай тэрыторыі краіны, якая разгарнула магутны рух супраціўлення ворагу. Толькі ў Беларусі былі створаны і вялі актыўную ўзброеную вайну 213 партызанскіх брыгад і 258 партызанскіх атрадаў, у якіх налічвалася больш за 370 тысяч байцоў. Дзесяткі тысяч патрыётаў былі членамі падпольных арганізацый. Беларусь па праву заслужыла званне рэспублікі-партызанкі.

Перамога дасталася нам дарагой цаной. Мільёны герояў аддалі свае жыцці на алтар Айчыны. Толькі з нашай рэспублікі загінула не менш 3 млн. чалавек, не кажучы аб вялікіх матэрыяльных стратах.

Але савецкі народ выстаяў, перамог і не толькі адрадзіў, але і павялічыў свае дасягненні ў эканоміцы, культуры, навуцы, у стварэнні абароннай магутнасці краіны, у абароне міру на Зямлі. І нягледзячы на нелады апошніх перабудовачных гадоў, беларускі народ не губляе надзеі на лепшае будучае і ўрачыста адзначае 55-ю гадавіну Вялікай Перамогі.

Калектыў нашага універсітэта ганарыцца тым, што ў яго саставе працавалі і яшчэ працуюць многія актыўныя ўдзельнікі барацьбы за вызваленне сваёй і многіх іншых краін свету ад фашысцкай няволі. На жаль, іх з кожным годам становіцца ўсё менш. Толькі за апошнія тры гады мы праводзілі ў апошні шлях больш 15 ветэранаў вайны.

Сярод тых, хто яшчэ працуе або знаходзіцца на заслужаным адпачынку, але вядзе актыўны лад жыцця, трэба перш за ўсё назваць таварышаў І.Ф.Харламава, М.В.Навучыцеля, А.С.Калугіна, В.М.Рупіна, А.А.Косцікава, М.А.Дзмітрыева, М.П.Шкарбуна і інш. Іх — 41 чалавек. Гэтыя ветэраны і зараз яшчэ ў страі абаронцаў Радзімы, уносяць свой пасільны ўклад ў патрыятычнае выхаванне моладзі.

**Г.ЕЎДАКІМЕНКА,**
**маёр у адстаўцы, інвалід вайны 2-й групы, удзельнік баёў на Цэнтральным, Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім і 3-м Беларускім франтах.**

## НАКАЗ — БЕРАГЧЫ МІР

Пад дэвізам "Салют, Перамога!" прайшла сустрэча, якая была арганізавана абласным аддзяленнем Беларускага Фонду міру сумесна з рэктаратам, прафкомам, аддзелам выхаваўчай работы і культурным цэнтрам са студэнтамі і выкладчыкамі нашага універсітэта. Яна была прысвечана 55-годдзю Перамогі.

З уступным словам выступіў старшыня абласнога праўлення БФМ Т.І.Глушакоў. Ён зрабіў кароткую справаздачу аб рабоце Гомельскага аддзялення Фонду, расказаў аб дабрачыннай дзейнасці, аб канкрэтных справах і шматлікіх добрых пачынаннях гамяльчан.

У нейкім сэнсе пашанцавала тым, хто прысутнічаў на сустрэчы, бо не кожны дзень можна сустрэцца і пагутарыць з героем. У Гомельскай вобласці іх засталося чатыры, а ў Гомелі — адзін. Гэта Герой Савецкага Саюза Д.Н.Пеняз ькоў. На выгляд сціплы, але як цёпла і сардэчна ён расказваў аб сваіх баявых саратніках, аб тых, хто не вярнуўся з франтоў Вялікай Айчыннай вайны. Д.Н.Пеняз ькоў падкрэсліў вялікую ролю ўсяго савецкага народа, які набліжаў перамогу і на франтах, і ў тыле. Удвая было прыемна тым студэнтам, якія атрымалі разавыя заахвочвальныя стыпендыі з рук героя. За актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта, горада і вобласці Фонд устанавіў 19 такіх стыпендый.

Кульмінацыяй сустрэчы было выступленне палкоўніка, кандыдата педагагічных навук, аўтара кнігі "Героі Савецкага Саюза, поўныя кавалеры ордэна славы Гомельшчыны" С.Ф.Шакарова. Ён не толькі адказаў на пытанні і расказаў пра свае маладыя гады, абпаленыя вайной, але і выканаў некалькі песень ваенных гадоў пад акампанемент баяна. Прыемна, што некаторыя маладыя людзі падпявалі салісту-ветэрану.

У канцы сустрэчы прысутнічаючыя цёплымі апладысментамі падзякавалі ветэранаў, пажадалі здароўя і сухога пораху ў парахаўніцах, уручылі ім кветкі. У сваю чаргу воіны-інтэрнацыяналісты павіншавалі ўсіх з 55-годдзем Перамогі і далі моладзі наказ — берагчы мір.

Вялікі вам дзякуй! З Днём Перамогі!.

**Г.ВАРОНІН,**
**начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю.**

**Навукова-практычная канферэнцыя**

## АБ РЭАЛІЯХ ВАЙНЫ

Гомельская гарадская арганізацыя Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў правяла ў ГДУ навукова-практычную канферэнцыю, прысвечаную 55-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг. Яе мэта — паказаць сучаснай моладзі праўду аб Вялікай Айчыннай вайне і крыніцах перамогі.

Студэнты універсітэта, якія прынялі ўдзел у канферэнцыі, заслухалі даклады ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, хто са зброяй у руках здабываў доўгачаканую перамогу, вучоных-гісторыкаў аб гераізме савецкага народа, яго самаахвярнасці на франтах і ў глыбокім тыле, аб партызанскім і падпольным руху ў Беларусі, ролі партыі і Вярхоўнага Галоўнакамандуючага І.В.Сталіна ў перамозе над фашызмам, крытыцы фальсіфікатараў другой сусветнай вайны і інш.

У знак удзячнасці студэнты ўручылі ветэранам кветкі.

## ЗАСЛУЖЫЛІ ПАМЯЦЬ І ПАШАНУ

Па добрай даўняй традыцыі сёння ва універсітэце зноў збяруцца ўдзельнікі і ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, былыя падпольшчыкі і партызаны. Ва ўрачыстай абстаноўцы напярэдадні 55-ай гадавіны Вялікай Перамогі яны адзначаць гэту гістарычную дату. Са славутым святам абаронцаў Радзімы павіншуюць прадстаўнікі рэктарата, прафкомаў і іншых грамадскіх арганізацый, уручаць матэрыяльную дапамогу.

У студэнцкім парку да брацкіх магіл загінуўшых суайчыннікаў, якія аддалі сваё жыццё ў барацьбе з ворагам, будуць ускладзены вянкі і кветкі. Мінутай маўчання будзе ўшанавана памяць змагароў за вызваленне Айчыны.

## БУДУЧЫНЯ – ЗА ТВОРЧЫМІ НАТУРАМІ

У выставачнай зале універсітэта цяпер пасабліваму ажыўлена. На абласную выстаўку дзіцячай тэхнічнай творчасці, прысвечанай 55-годдзю вялікай Перамогі, прыходзяць не толькі студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ. Са шматлікімі яе экспанатамі (іх тут каля 300) з вялікай цікавасцю знаёмяцца і вучні школ г.Гомеля, і ўжо дарослыя, сталыя людзі, у каго ёсць іскрынка творчай фантазіі і жаданне пераўтварыць яе ў рэальнасць.

Наша навучальная ўстанова не выпадкова стала месцам правядзення гэтай выстаўкі. На фізічным факультэце ГДУ рыхтуюць настаўнікаў фізікі з дадатковай спецыяльнасцю педагогаў-арганізатараў тэхнічнай творчасці. Да таго ж, на нядаўняй рэспубліканскай выстаўцы тэхнічнай творчасці вучнёўскай моладзі "Юныя тэхнікі — Радзіме", якая праходзіла ў г.Мінску, студэнцкі калектыў кафедры агульнай фізікі ГДУ стаў яе прызёрам і ўдастоены Дыплома І ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Такі ж дыплом атрымаў і студэнт гр.Ф-32 Віталь Шарамет.

Экспанаты выстаўкі захапляюць, здзіўляюць і ўражваюць, дзякуючы ўмелым рукам, дапытліваму розуму школьнікаў, арыгінальнасці іх задум. На выстаўцы прадстаўлена практычна ўся наша вобласць: ад абласнога цэнтра да далёкай палескай вёсачкі з Лельчыцкага раёна. Члены клубаў тэхнічнай творчасці дэманструюць мадэлі ракет, караблёў, самалётаў, машын, тут жа -- вытанчаныя, прыгожыя вырабы з дрэва, шкла, тканіны, кардону...

Павышаную ўвагу наведвальнікаў выклікаюць экспанаты студэнтаў спецыяльнасці "Фізіка і тэхнічная творчасць", якія займаюцца ў творчых клубах "Электроніка" і "Мадэліст-канструктар". Кіруюць імі адпаведна ст.выкладчыкі кафедры агульнай фізікі І.М.Якаўцаў і У.А.Замятнін. Сярод іх — некалькі відаў перагаворных прыстасаванняў, лазерныя і шматканальныя мадэлі сувязі, а таксама розныя інструменты для вырабу дэталяў мадэляў, вымяральныя стэнды для выпрабаванняў канструкцый мадэляў і інш. Тут і самастойныя работы вучняў, выкананыя пад кіраўніцтвам студэнтаў спецыяльнасці ФТТ, і сумесныя з імі праекты.

"Рабяты выйшлі за рамкі звычайнага мадэліравання, іх работы неабходна прапагандаваць для прамысловага ўкаранення", — такія словы пакінуты адным з наведвальнікаў выстаўкі ў Кнізе водгукаў.

На базе выстаўкі праведзены міжабласны семінар "Падрыхтоўка педагагічных кадраў па тэхнічнай творчасці ў Гомельскім дзяржуніверсітэце". У ім прынялі ўдзел дырэктар рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў В.І.Цвірко, дырэктары абласных і раённых цэнтраў тэхнічнай творчасці рэспублікі. Абмеркаваны праблемы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў па мадэліраванню і развіццю новых напрамкаў у тэхнічнай творчасці. У час сустрэчы ўдзельнікаў семінара з прарэктарам па навуковай рабоце прафесарам Д.Р.Лінам ішла гаворка аб далейшым супрацоўніцтве, акрэслены сумесны план дзеянняў на перспектыву.

Журы вызначыла пераможцаў выстаўкі, якім уручаны граматы і падарункі. Спонсарамі мерапрыемства з'явіліся камітэт па справах моладзі аблвыканкома, Беларускае таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў, абласны камітэт БПСМ і інш.

Нашы дзеці — таленавітыя, значыць, у нашай краіны ёсць будучыня. Гэта яскрава пацвердзіла праведзеная выстаўка.

**Т.НІКАЛАЕВА.**



# СЁННЯ – МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ДРУКУ

Цяпер нікому з нас не ўяўляецца жыццё без друкаванай прадукцыі. Ні адна сям'я, ні адзін свядомы чалавек не можа абысціся без газет, часопісаў, кніг. Яны садзейнічаюць павышэнню нашага адукацыйнага ўзроўню, пашырэнню кругагляду, фарміраванню грамадзянскай пазіцыі.

Друкаванае слова валодае вялікай сілай, мае неацэннае значэнне ў сваім пазнаваўчым і выхаваўчым прызначэнні. Нездарма ўжо даўно друк прызнаюць за чацвёртую ўладу.

Дзень друку — свята не толькі прафесіянальных журналістаў, паліграфістаў, але і вялікай арміі пазаштатных аўтараў перыядычных выданняў, усіх іх чытачоў.

Ідзе 31-ы год як выкладчыкі, супрацоўнікі, аспіранты і студэнты атрымліваюць нашу газету "Гомельскі універсітэт". Недалёка той дзень, калі ў свет выйдзе яе юбілейны 1000-ы нумар. У агульнай колькасці — гэта шмат тамоў, у якіх адлюстраваны шляхі зараджэння, станаўлення і развіцця вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установы Беларускага Палесся. Прыемна адзначыць, што сярод былых і цяперашніх пазаштатных аўтараў нашай газеты каля 20 членаў Саюза пісьменнікаў і яшчэ больш — членаў Саюза журналістаў Беларусі, шмат вучоных.

Склад нашых надзейных сяброў, пазаштатных аўтараў з кожным годам абнаўляецца. Сярод іх шмат здольнай творчай моладзі і цяпер. Думаем, што няма патрэбы выдзяляць кагосьці асабіста, бо кожны, хто па закліку сэрца далучаецца да вельмі важнай і пачэснай справы — журналісцкай дзейнасці, — заслугоўвае павагі і ўдзячнасці.

З нагоды Міжнароднага Дня друку прыміце, шаноўныя сябры, нашы віншаванні і найлепшыя пажаданні!

**Рэдакцыя газеты "Гомельскі універсітэт".**

**Таварыства "Веды"**

# ДАВЕРАНА НАШЫМ ВУЧОНЫМ

Адбыўся пленум праўлення абласной арганізацыі таварыства "Веды". На ім было разгледжана арганізацыйнае пытанне. Старшынёй праўлення абласной арганізацыі названага таварыства выбраны прарэктар нашага універсітэта па вучэбнай рабоце доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар С.Ф.Каморнікаў, старшынёй рэвізійнай камісіі — загадчык кафедры бухуліку кандыдат эканамічных навук, дацэнт У.П.Бабына.

# ВЫВУЧАЮЦЬ РУСКУЮ МОВУ АНГЛІЧАНЕ

У нашым універсітэце знаходзілася дэлегацыя з англійскага горада Бірмінгем, яго моўнага Цэнтра Брасхаус. У ім людзі самых розных прафесій і ўзростаў па сваім жаданні вывучаюць любую мову. Згодна заключанага з ГДУ дагавора аб супрацоўніцтве Цэнтр два разы на год накіроўвае да нас групу англічан, якія вырашылі авалодаць рускай мовай.

На чале з кіраўніком рускай секцыі Цэнтра Смітхай Прасадам да нас прыязджалі некалькі студэнтаў, акцёр, бізнесмен, дэфектолаг, сталявар, для якіх выкладчыкі філалагічнага факультэта ГДУ правялі вучэбныя заняткі. Самі госці праявілі актыўнасць у зносінах са студэнтамі універсітэта, якія авалодваюць спецыяльнасцю "Англійская мова".

Знаходжанне англічан на беларускай зямлі, абпаленай Чарнобылем, не абмяжоўвалася толькі моўнай практыкай. Ім ужо добра вядомы адрас дзіцячага санаторыя "Жывіца" ва ўрочышчы Чонкі. У гэтую лячэбную ўстанову раней імі было дастаўлена неабходнае медыцынскае абсталяванне. І на гэты раз дэлегацыя з далёкага Бірмінгема наведала санаторый не з пустымі рукамі: дзецям былі прывезены розныя падарункі, ласункі і інш.

Маленькія пацыенты "Жывіцы" выступілі перад гасцямі з канцэртам, падарылі ім спецыяльна афармлены альбом з фотаздымкамі, а таксама сувеніры, зробленыя ўласнымі рукамі.

У абласной бібліятэцы госці з Вялікабрытаніі сустрэліся таксама з гамяльчанамі, што вывучаюць англійскую мову, зрабілі экскурсію ў Веткаўскі музей народной творчасці, паглядзелі прадстаўленне ў гомельскім цырку.

**(Наш кар.)**

**На Савеце універсітэта**

# ВЫЗНАЧАНЫ ЛАЎРЭАТЫ СКАРЫНАЎСКІХ ЧЫТАННЯЎ

На красавіцкім пасяджэнні Савета універсітэта па рэкамендацыі яго конкурснай камісіі зацверджаны лепшыя навуковыя працы, якія дапушчаны на штогадовыя Скарынаўскія чытанні. Іх лаўрэатамі прызнаны доктар эканамічных навук У.К.Драчоў (кафедра эканамічных тэорый), кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт У.Р.Ермакоў (кафедра матаналізу), кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт А.А.Ружыцкая (кафедра ВМ і праграміравання), кандыдат сацыялагічных навук А.Я.Рычкоў (кафедра палітычнай сацыялогіі), кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт С.А.Хахомаў (кафедра агульнай фізікі).

Скарынаўскія чытанні адбудуцца на майскім пашыраным пасяджэнні Савета універсітэта.

# МІЖНАРОДНЫЯ СТУДЭНЦКІЯ ГАГАРЫНСКІЯ ЧЫТАННІ

Вось ужо больш чвэрці стагоддзя ў Расійскім дзяржаўным універсітэце імя К.Э.Цыялкоўскага праводзіцца навуковая студэнцкая канферэнцыя "Гагарынскія чытанні". Узнікла яна са студэнцкай навукова-тэхнічнай канферэнцыі, якая кожны год падводзіла вынікі работы студэнтаў і аспірантаў усіх факультэтаў Маскоўскага авіяцыйнага тэхналагічнага інстытута імя К.Э.Цыялкоўскага за чарговы навучальны год. Пасля палёту Юрыя Аляксеевіча Гагарына 12 красавіка 1961 года і наведвання ім інстытута, улічваючы яго авіяцыйна-ракетны профіль, было прынята рашэнне назваць штогадовую вясеннюю навуковую канферэнцыю Гагарынскай. Так з 1974 года ў інстытуце стала праводзіцца спачатку Маскоўская, пасля Усерасійская, Усесаюзная, а зараз і Міжнародная навуковая маладзёжная канферэнцыя "Гагарынскія чытанні".

Сёлета ў Расійскім дзяржаўным універсітэце імя К.Э.Цыялкоўскага з 11 па 15 красавіка праводзілася чарговая Міжнародная маладзёжная навуковая канферэнцыя — "XXVI Гагарынскія чытанні". Больш 200 ВНУ Расіі, Беларусі, Украіны, а таксама Англіі, Францыі і Паўночнай Карэі прынялі ўдзел у гэтых чытаннях. У двух тамах было апублікавана каля 1200 тэзісаў дакладаў канферэнцыі.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны быў прадстаўлены на гэтых чытаннях пяцю работамі фізічнага факультэта. У праграму канферэнцыі былі ўключаны тры работы: студэнта універсітэта А.Еўтухова (навуковы кіраўнік — дацэнт, к.ф.-м.н. В.У.Свірыдава) і работа аспірантаў Ю.Нікіцюка, І.Каморнікава, студэнта А.Купо (навуковы кіраўнік — дацэнт, к.ф.-м.н. С.В.Шалупаеў). З дакладам выступіў Ю.Нікіцюк, І.Каморнікаў быў садакладчыкам. Творчаму калектыву работы, выкананай пад кіраўніцтвам дэкана фізічнага факультэта універсітэта, заг.кафедры радыёфізікі і электронікі С.В.Шалупаева, быў прысуджаны Дыплом ІІ ступені Гагарынскіх чытанняў 2000 года.

Навукова-даследчы сектар універсітэта віншуе дыпламантаў Гагарынскіх чытанняў і іх кіраўніка з належнай ацэнкай іх работы, жадае ім новых творчых поспехаў.

**В.СКРЭЖЭНДЗЕЎСКАЯ, вядучы інжынер СНТІ НДС.**

**Конкурсы**

# САМАЯ АБАЯЛЬНАЯ

У Мінску, у акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў прайшоў чарговы беларуска-расійскі міжвузаўскі конкурс грацыі і артыстычнага майстэрства "Каралева Вясна-2000". У шасцёрку яго пераможцаў увайшла студэнтка 1 курса філалагічнага факультэта нашага універсітэта Аксана Бандарэнка.

Затым прыгажуні працягвалі спаборніцтвы грацыі, маладосці, артыстызму ў канцэртнай зале "Мінск" беларускай сталіцы. ІІ-е месца ў ім заваявала Аксана. Ёй прысуджана званне "Міс Абаяльнасць". Дзяўчына атрымала дыплом і каштоўны падарунак — тэлевізар "Гарызонт".

# МОЛАДА, ДЫ НЕ ЗЕЛЕНА

Дзяржкамітэт па друку, Дзяржкамітэт па справах моладзі і Саюз беларускіх пісьменнікаў вызначылі пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу на лепшы літаратурны твор сярод маладых аўтараў. Яго лаўрэатам па раздзелу "Крытыка" стала і Юлія Сальнікава, асістэнт кафедры беларускай літаратуры. Яна ўпэўнена заявіла аб сабе крытычнымі артыкуламі ў вядомых рэспубліканскіх выданнях.

Варта нагадаць, што па выніках мінулага года яна стала таксама лаўрэатам Нацыянальнай акадэміі навук за лепшую студэнцкую работу.



# ГЕАГРАФІЯ КРОЧЫЦЬ У XXI СТАГОДДЗЕ

Будучыня геаграфічнай навукі залежыць ад таго, наколькі пасяхова зможа рэалізаваць свае творчыя здольнасці маладое пакаленне даследчыкаў. Каб дапамагчы сённяшнім школьнікам раскрыць свой творчы патэнцыял, далучыць іх да сур'ёзнай навуковай працы, на геолага-геаграфічным факультэце была арганізавана канферэнцыя школьнікаў па геаграфіі. Яна прайшла пад дэвізам "Геаграфія на парозе XXI стагоддзя".

Удзельнікамі канферэнцыі сталі вучні базавых навучальных устаноў ГДУ, школ Гомеля і вобласці. Арганізацыйны камітэт грунтоўна вывучаў тэзісы дакладаў школьнікаў. Ужо на гэтым этапе работы арганізатарам канферэнцыі стала відавочна, што даследчыцкая работа вучняў па геаграфіі ў многіх школах знаходзіцца на дастаткова высокім узроўні, і што ў дзень работы канферэнцыі нас чакае цікавы дыялог з юнымі даследчыкамі-географамі. Трэба сказаць, што гэтыя спадзяванні пацвердзіліся.

Вялікая лекцыйная аўдыторыя ледзь змагла змясціць усіх жадаючых паўдзельнічаць у рабоце канферэнцыі. Сярод прысутных былі вучні многіх школ горада Гомеля і раёнаў вобласці, настаўнікі, метадысты, студэнты-географы. Адкрыў канферэнцыю дэкан геолага-геаграфічнага факультэта дацэнт Г.А.Сербін. Звяртаючыся да ўдзельнікаў, ён адзначыў, што іх даследчыцкая работа выклікае вялікую цікавасць у выкладчыкаў і супрацоўнікаў геафака, і выказаў пажаданне, каб у хуткім часе сённяшнія школьнікі прадоўжылі свае даследаванні ўжо як студэнты геолага-геаграфічнага факультэта. Аб стане навукова-даследчыцкай работы студэнтаў-географаў расказаў кіраўнік НДРС па геаграфіі ст.выкладчык У.Я.Пашук.

Навуковыя канферэнцыі звычайна пачынаюцца з пленарных дакладаў. Не стала выключэннем і наша. З дакладам "Маніторынг навакольнага асяроддзя" выступіла студэнтка ІІ курса спецыяльнасці "Геаграфія" Алена Акуліч — уладальніца ўжо двух дыпломаў па выніках НДРС па геаграфіі. І ўсё ж цэнтральнае месца ў рабоце канферэнцыі было адведзена дакладам школьнікаў. У сваіх выступленнях вучні пазнаёмілі прысутных з вынікамі сваёй працы па розных напрамках геаграфічных даследаванняў, шмат увагі яны ўдзялілі экалагічнай і сацыяльна-эканамічнай праблематыцы. Большасць дакладчыкаў склалі вучні 11-х класаў, для іх выступленне на канферэнцыі стала своеасаблівай справаздачай і адначасова заяўкай на будучыню. Працы выпускнікоў школ адрозніваліся навуковасцю і грунтоўнасцю, але ж самы шчыры прыём аўдыторыі выклікаў даклад вучня 6-га класа СШ № 59 г.Гомеля Аляксея Буля "Мікраклімат 17-га мікрараёна "Гомеля". Аргкамітэт канферэнцыі ўзнагародзіў Аляксея спецыяльным прызам.

Па выніках канферэнцыі дыпломамі І ступені былі ўзнагароджаны вучні Брылёўскай СШ Гомельскага раёна Алена Афанасенка і Максім Агалаў, якія прадставілі даклад "Уплыў геаграфічнага становішча на экалагічную сітуацыю п.Мічурынскае". Дыпломы ІІ ступені атрымалі Сяргей Нічыпарук (СШ № 56 г.Гомеля "Перспектывы развіцця ветравой энергетыкі ў Беларусі") і Кірыл Пуцімцаў (Чаплінская СШ Лоеўскага раёна "Стан навакольнага асяроддзя і яго ўздзеянне на чалавека ў Гомельскай вобласці"). Дыпломамі ІІІ ступені былі адзначаны Святлана Камоза і Таццяна Халецкая (Гомельскі гарадскі ліцэй № 1 "Вывучэнне рэгіянальных асаблівасцей структуры прамысловасці Расіі з дапамогай статыстычных метадаў"). Для ўсіх прызёраў арганізатары канферэнцыі падрыхтавалі каштоўныя падарункі.

Работа канферэнцыі не абмяжоўвалася сценамі адной аўдыторыі. Школьнікі наведалі вучэбныя кабінеты і лабараторыі, змаглі самі папрацаваць з разнастайнымі прыладамі, вывучалі мінералагічныя калекцыі. Для ўдзельнікаў канферэнцыі быў наладжаны "круглы стол".

Хочацца спадзявацца, што першая канферэнцыя школьнікаў па геаграфіі стане традыцыйнай і будзе дапамагаць ім рэалізоўваць свае здольнасці і схільнасці, рыхтавацца да наступнай навуковай працы ў сценах універсітэта.

**Ю.КУНДРАТ, нам.дэкана геолага-геаграфічнага факультэта па прафарыентацыйнай рабоце.**

*На протяжении 8 дней представители различных общественных движений Гомельской области знакомились с системой управления и самоуправления Дании. В их числе было три преподавателя нашего университета: профессор кафедры оптики Г.С.Митюрич, ст.преподаватель кафедры белорусской культуры В.М.Лебедева и автор этих строк.*

*Группу из Беларуси принимал Центр образования города Тёрринг. В Дании были проведены встречи с депутатом парламента Сёреном Хансеном; членом областного управления амта Вайле Хелле Кнудсеном; бургомистром органа муниципального управления — коммуны Тёрринг-Ульдум — Фреде Якобсеном. Мы познакомились с основными направлениями деятельности центра подготовки кадров для рынка труда Хорсенс-Силькеборг, центра образования в Тёрринге, местного отделения профсоюзов СИД в Гиве, службы занятиости в Вайле.*

*Интересным было посещение музея скульптуры под открытым небом, Боулинг-центра, музея истории королевской семьи.*

*Дни пребывания в чужой стране пролетели незаметно. Интерес вызывало абсолютно все: иная культура, иные люди, иные взгляды, иное отношение к жизни и окружающим.*

# СТРАНА, ГДЕ ЕСТЬ ЧЕМУ ПОУЧИТЬСЯ



**Одна из улиц Копенгагена.**

## ГОСУДАРСТВЕННОЕ УСТРОЙСТВО

Для Дании характерна децентрализация. Выделяют три уровня управления государством: вся страна; амты; коммуны.

Большинство функций распределены между амтами и коммунами. Самые большие задачи решаются на низшем уровне. Руководят в основном политологи по образованию, так как считается, что для эффективного руководства деятельностью какого-либо органа управления главное умение управлять, организовать работу.

Парламент состоит из 179 депутатов. С 1915 года право голоса имеют женщины. Сейчас в парламенте их примерно 40%.

Выборы депутатов осуществляются двумя путями: через округа по партийным спискам или через одномандатные округа. Для того, чтобы пройти в парламент, надо набрать минимум 2 % голосов избирателей.

Сейчас у власти партии меньшинства: социал-демократы и радикально-либеральная партия. Средний возраст членов парламента — 50 лет, самому молодому депутату 22 года. Однако минимальный возраст для избрания — 18 лет.

Депутат парламента 2-3 раза в неделю проводит встречи с избирателями (интервью в газетах, встречи с трудовыми коллективами, профсоюзами, гражданами). Каждый год избранную кандидатуру подтверждает партия, членом которой является депутат. Если он недостаточно эффективно работает, не проводит линию его партии, на следующий срок выдвинут и избран не будет.

При избрании в парламент не предоставляют ни справок о состоянии здоровья, ни налоговых деклараций, ни свидетельств о непривлечении к уголовной ответственности — главное нравиться избирателям. Если обнаружатся какие-либо недовольства депутатом после избрания, его все равно придется терпеть до очередных выборов. Среди депутатов распространена поговорка: “Избиратели говорят раз в четыре года”.

Все депутаты получают зарплату — около 400 тысяч крон в год. Однако работа рассчитана на 0,5 ставки. Ограничений на работу параллельно в других местах для депутатов нет. Не существует и ограничений на занятие одновременно мест в исполнительной и законодательной ветвях власти. Министр одновременно может быть и членом парламента. Естественно, и зарплату получает одновременно в двух местах.

Поскольку нашу группу принимал Центр образования города Тёрринг, который находится в амте Вайле, деятельность амта можно рассмотреть на его примере.

Амт Вайле — один из 14 в Дании. Интересы 350 тысяч жителей представляет 31 депутат. Депутаты, по их мнению, зарабатывают немного. Полную зарплату получает только бургомистр. Однако заинтересованных в местном управлении, желающих влиять на политические процессы в обществе предостаточно. Положение чиновника амта и чиновника министерства абсолютно одинаково. Все они ничем не отличаются от частных служащих. Но очень ценят свою работу. “Я оказываю влияние на решения, могу самостоятельно планировать работу моего амта”. Депутаты обладают высокой моралью, население предъявляет к ним повышенные требования. Поэтому дополнительные блага чиновник себе позволить не может.

Как и другие амты Вайле выполняют основные функции: содержание больниц; работа гимназий; решение социальных вопросов (в том числе и содержание учреждений для инвалидов); содержание в надлежащем состоянии дорог; решение вопросов по охране окружающей среды и др. вопросы, которые не может решить более мелкая единица.

Для решения своих проблем амты имеют право назначать свой налог, размер которого каждый год может быть различным. Однако государство установило коридор этого налога 9-10%. Больше средств на решение своих задач амт не получает ниоткуда.

Ближе всего к гражданам коммуна, поэтому и задач больше всего у нее.

Мы посетили коммуну Тёрринг-Умту. Это типичная сельскохозяйственная коммуна, которая объединяет 12 200 человек, 4,5 тысячи семей. Возглавляют ее 19 членов городского Совета, которые избираются на 4 года. Все решения принимаются большинством голосов. В Совет входят представители 5 партий: социал-демократической — 6, консервативной — 1, социал-народной — 1, датской народной — 2, либеральной партии Венстра — 9.

Коммуну возглавляет бургомистр Фреде Якобсен. Помимо своей работы в коммуне, он имеет ферму, 95 коров, 50 га земли для выращивания злаков. Работает в основном сам, имеет всего одного помощника.

В Совете созданы комиссии, курирующие наиболее значимые для коммуны сферы жизнедеятельности: финансовая, социальная, здравоохранительная, окружающей среды, по школам и культуре. В состав комиссий могут входить не только члены Совета, но и помощники со стороны наиболее активных неравнодушных жителей. Так, в состав комиссии по школам входят наряду с членами городского комитета еще и родители. Комиссии заседают 1-2 раза в месяц по мере необходимости.

Для проведения решений Совета есть 70 административных работников. Однако заработную плату в коммуне получают 750 человек (к ним относятся учителя, работники детских садов и т.п.)

На балансе коммуны Тёрринг-Ульдум состоят: 6 школ, 10 детских садов, 5 домов по уходу за пожилыми, 1 главная библиотека и 2 филиала, 1 бассейн, футбольные поля (в каждом поселке), 4 очистных сооружения, 275 километров дорог.

Таким образом, коммуна четко представляет свои задачи, а жители знают, что могут требовать (и требуют) от городского совета, заплатив налоги.

В основном коммуна занимается сельскохозяйственной деятельностью. Но есть и предприятия — деревообрабатывающие и металлообрабатывающие.

Деятельность коммуны курирует Контрольный совет, созданный в амте. Он следит, чтобы работа коммуны не выходила за рамки ее компетенции, осуществляет контроль за экологией. Косвенный надзор амт осуществляет через ежегодные финансовые отчеты, которые подвергаются аудиторской проверке, где выявляются нарушения в целевом и целесообразном использовании средств.

Для осуществления более широкой деятельности, выходящей за рамки одной коммуны, создаются ассоциации коммун в масштабе страны и областные ассоциации коммун.

Коммуна поддерживает тесные контакты с коммунами-побратимами в Норвегии, Швеции, Финляндии. Есть задумки найти единомышленников в Прибалтике. Проводят раз в год встречи, где обсуждают общие проблемы, делятся опытом и новыми задумками.

На наши предложения найти себе “побратимов” в Белоруссии, бургомистр Фреде Якобсен засомневался — масштабы несоразмеримы.

## НАЛОГИ

Поскольку для Датского государства характерна децентрализация, налоги собираются и распределяются снизу. Налоги собирает коммуна (аналог нашего района). Размер зависит от года и коммуны. Если территория благоустроена, больших расходов не предвидится — налог, соответственно, будет меньше. Все зависит от размера необходимых для разрешения проблем. Правда, и там возможно небольшое перераспределение средств между коммунами: “если уж очень бедная”, налоги платят все.

Размер коммунального налога составляет примерно 20 процентов.

Амты (наш аналог области) собирают налог примерно в 9 процентов: на содержание больниц, на образование (амты должны содержать гимназии — старшие классы школ).

Налог на общественные структуры — государству самый незначительный по размеру. Он в основном распределяется на пенсии и пособия по безработице.

Можно платить еще и церковный налог — менее одного процента (зависит от церкви). Такой налог платит только тот, кто входит в какую-либо церковь. Уплата данного налога позволяет все церковные обряды осуществлять бесплатно.

Таким образом, в Дании предусмотрено три ступени налоговых платежей: нижний, средний, верхний.

Налоги платят все: и студенты, и пенсионеры. Льготы примерно похожи на наши. Чем больше долгов, тем выгоднее гражданину, поскольку при предоставлении льгот учитывают затраты на приобретение, например, дома, автомобиля и т.п.

Например, датчанин получил за год 100 крон (один доллар стоит примерно 7 крон). 9 процентов он должен сразу отдать для развития рынка труда. Если купил дом, машину, произвел другие затраты — примерно 50 крон в год можно вычесть из суммы, облагаемой налогом. Остается 49 крон, с которых и платятся остальные налоги по ставкам. Обычная ставка налога около 46 процентов.

Алименты налогом не облагаются. Алименты у плательщика берет коммуна, она же их и выплачивает. Можно удерживать алименты и из зарплаты, но в Дании это стыдно, тогда все узнают. Поскольку бухгалтерия на предприятии выплачивает только зарплату. Остальное не ее дело, а самого гражданина.

Королевская семья налогов не платит. Но, к примеру, ремонт делает в своих апартаментах сама. Как все, ищет компании подешевле. Правда, строительной компании престижно сделать ремонт в королевском дворце — это своеобразная реклама.

Коммуны называют себя предприятиями по оказанию услуг.

Заплатив налог, можно требовать от коммуны выполнения ее обязанностей, чем датчане очень эффективно пользуются. К примеру, поддержание дорог в надлежащем состоянии — задача коммуны. Если на дороге кто-то обнаружит, пусть и небольшую, выбоину, сообщит немедленно в коммуну, через непродолжительное время неудобство будет ликвидировано. “Я плачу деньги — я и требую устранить неисправность, вдруг что-нибудь случится”.

## ЦЕНТР ЗАНЯТОСТИ г.ВАЙЛЕ

Главное его назначение — оказать помощь в поиске работы. Руководство осуществляет региональный Совет рынка труда, куда входят представители работников и работодателей. Совет выполняет организационные и управленческие функции, составляет планы работы, сметы и т.п. В 1999 году в работе Совета было задействовано 174 работника.

Годовой бюджет Центра составляет 1,7 млн. евро.

Услугами бирж труда пользуются ежегодно около 10 тысяч безработных, что составляет около 5% активного населения. Избегать биржи невыгодно, поскольку тогда не будешь получать пособие, а его имеют все безработные (и достаточно большую сумму).

Пособие получают практически все. Для этого необходимо проработать 1 год, после чего имеешь право на пособие по безработице в течение 4 лет (суммарно). Для того, чтобы заслужить материальную поддержку на новый срок, необходимо проработать хотя бы 6 месяцев. Пособие составляет 90% от заработной платы, но не выше 13100 крон в месяц.

Пособие можно получать, даже если где-то работаешь, но занят не полный рабочий день. В этом случае лицо обращается на биржу с просьбой помочь подыскать работу до полной занятости. И пока биржа пытается помочь, работающий не на полную ставку пропорционально получает пособие за неиспользованное время.

Работу находят сравнительно быстро, многие — в течение 6 недель. Средний срок состояния на учете — 32 недели.

Первый год сам безработный ищет работу, его никто не торопит. Затем служба занятости обращает на него внимание и анализирует ситуацию: почему человек уже год не работает. Проводится собеседование, разрабатывается план помощи, могут отправить бесплатно на курсы переподготовки (на это бирже выделяют около 70 млн. евро). Пока безработный ходит на курсы — пособие не получает, но получает компенсацию от службы занятости (т.е. те же деньги, но из другого источника — так что безработному все равно).

Биржи обслуживают также и тех, кто не может найти себя в профессии, хочет поменять работу. Для них составляются индивидуальные планы, учитываются уровень образования, трудовой опыт, статус, характер человека, интересы и т.п.

Среди безработных больше всего неквалифицированных работников и страдающих профессиональными заболеваниями. Пополняют ряды ищущих работу также и специалисты отмирающих профессий. Для датчан характерен принцип: если в другой стране производство чего-нибудь обходится дешевле, зачем этим заниматься в Дании. И, действительно, в стране очень много импортных товаров (Китай, Тайвань...)

За 1999 год из 350 тысяч живущих в амте Вайле — 190 тысяч трудоспособных, из них — 180 тысяч работающих. Безработных около 10 тысяч — 6%. Однако свободных мест около 14 тысяч. Таким образом, безработицы фактически нет.

**И.ЭСМАНТОВИЧ,**
**доцент кафедры гражданско-правовых дисциплин юридического факультета.**

**(Продолжение следует).**

# УЧЕБА В США И ЕВРОПЕ: РЕАЛЬНОСТЬ ИЛИ МЕЧТА?

Случайно довелось стать свидетелем разговора между молодыми ребятами, явно выпускниками минского вуза, обсуждавшими объявления о возможности получения образования за рубежом. Девушка живо говорила о своей мечте учиться в американском или европейском вузе и о своем желании участвовать в объявленном конкурсе. Ее же спутник снисходительно охлаждал пыл подруги фразами типа: “Да это нереально! Там все схвачено, и без блата нечего и время терять”.

Ребята вышли из троллейбуса на следующей остановке, а я поймал себя на мысли, что еще пять лет назад думал так же, как и этот парень. Сегодня же, когда за плечами остались американский университет в Северной Каролине и британский в Сассексе плюс практика в Европарламенте, я имею все основания не согласиться с утверждением о невозможности поступить на учебу в западный вуз, пройдя конкурсный отбор в Минске.

Как правило, в конце лета или в начале осени в газетах появляются объявления о различных образовательных программах в США и странах Европы, спонсируемых зарубежными фондами или правительственными организациями. Поскольку обучение в заграничных вузах платное, причем для иностранцев плата обычно намного выше, чем для местных студентов, подобная спонсорская помощь, по сути, является для большинства из нас уникальной возможностью получить заветный диплом.

О росте популярности подобных программ свидетельствуют данные статистики. Если в конкурсах на учебные программы 1997-98 гг. приняло участие 1700 человек, из которых был отобран 71 финалист, то уже на 1998-99 гг. число конкурсантов увеличилось до 2802, из которых 165 вышли в финал. Эти данные отражают участие в наиболее крупных спонсорских проектах по англоязычным программам в США и Европе. Схожие проекты существуют и для Германии, Франции, Италии, Канады и других стран.

Информацию о подобных образовательных программах можно получить в таких организациях как ACCELS, IREX, USIS, Британском Совете, Институте Гете и др. Эти организации поддерживают между собой контакты, поэтому там вам всегда могут посоветовать, куда следует обратиться по интересующей вас теме.

К примеру, в минском информационно-образовательном центре ACCELS, расположенном в здании библиотеки Академии наук, так же, как и в главном офисе по проспекту Скорины 31-18, вы всегда можете узнать о предлагаемых программах и взять бланки заявок для участия в конкурсе. Сотрудники центра всегда окажут вам квалифицированную помощь и объяснят правила заполнения и подачи документов. Не поленитесь сделать несколько копий бланков — это позволит вам чувствовать себя спокойнее при их заполнении, потому что под рукой будет запасной экземпляр. При заполнении заявки, наряду с информацией о ваших успехах в школе и вузе, а также рекомендательными письмами, очень важным является пункт о ваших целях. Вам придется написать, чего вы ожидаете от данной программы и как она может вам помочь стать высококлассным специалистом и быть полезным в Беларуси. Если вам удастся довести этот пункт до вершин логической ясности и искренности, то это, несомненно, принесет вам дополнительные баллы при оценке комиссий.

Примерно через полтора-два месяца после подачи заявления вы получите уведомление, прошли ли вы в полуфинал или на этот раз вам не повезло. В случае неудачи не стоит отчаиваться — у вас есть шанс подать заявку на следующий год, возможно, даже на другие, более привлекательные программы. Кроме того, приобретенный опыт и навыки помогут вам составить следующую заявку более грамотно и весомо. Если цель ясна и вы стремитесь ее достигнуть — успех обязательно придет.

Для тех же, кто получил подтверждение, наступает пора подготовки к экзамену по английскому языку TOEFL. Как правило, этот тест является необходимым условием допуска к учебе в зарубежных вузах по большинству спонсорских программ. Готовиться к нему можно самостоятельно, купив набор TOEFL с аудиокассетами или на CDROM, если у вас есть компьютер. Кроме того, попрактиковаться можно и в центре ACCELS, где бесплатно предоставляются тесты TOEFL, GRE и другие. Ежедневные тренировки по три-шесть часов помогут вам достичь заветного результата в 600-620 баллов (необходимый минимум для большинства программ).

После прохождения экзамена вас ждет последнее испытание-собеседование (интервью) с представителем вашей программы, проводимое на английском языке. Итоги собеседования, наряду с результатами по TOEFL и изложением целей обучения, являются решающими факторами при принятии решения. Многое на собеседовании зависит от того, как вы сумеете справиться с волнением (поверьте, это серьезное испытание). Постарайтесь овладеть техникой релаксации. Она поможет вам унять выскакивающее из груди сердце и взять под контроль ноги и руки, готовые пуститься в пляс. Не лишним будет потренироваться перед зеркалом или в присутствии друга или родителей, дабы выявить все лишнее и назойливые движения типа почесывания носа. Четкость, уверенность, раскованность и искренность помогут вам достичь успеха на собеседовании.

После прохождения интервью вам остается только ждать результата, который обычно приходит через два-три месяца. Для тех немногих, кто получит приглашение на учебу с подтверждением о зачислении в вуз, настает время подготовки к скорому отъезду. Остается им пожелать интересной и насыщенной учебы за рубежом.

**Дмитрий ЦЕЛОК,**
**(“Аргументы и факты”).**

---

**СПОРТ**

## СКАРЫЎСЯ ЗАПАВЕТНЫ РУБЕЖ

У Брэсце прайшоў чэмпіянат Беларусі па пауэрліфтынгу (сілавому трохбор'ю). Зборныя Гомельскай вобласці ў камандным заліку занялі другое месца: жанчыны — пасля Мінскай вобласці, а мужчыны — пасля Мінска.

Майстар спорту міжнароднага класа Уладзімір Гадуноў (ф-т фізічнай культуры) заваяваў сярэбраную ўзнагароду, а Пётр Клімкоў з гэтага ж факультэта — бронзавую.

Упершыню нарматыў “Майстар спорту Рэспублікі Беларусь” выканалі: пяцікурснік матэматычнага факультэта Руслан Бародзіч і другакурснік факультэта фізічнай культуры Віктар Лосеў.

На чэмпіянаце пасведчанне і значок суддзі Нацыянальнай катэгорыі па пауэрліфтынгу ўручылі Уладзіміру Аляксандравічу Галавачу, з чым яго павіншавалі вучні.

## ДЗВЕ ПЕРАМОГІ НАШЫХ СТУДЭНТАЎ

У Мінску завяршыўся рэспубліканскі чэмпіянат па плаванню ў праграме круглагадовай спартакіяды вну.

У агульнакамандным заліку на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ўзняліся студэнты нашага універсітэта Сяргей Кузікаў і Ігар Карніенка, якіх трэніруе Б.М.Гіль. На наступных месцах — каманды Віцебскага і Брэсцкага універсітэтаў.

У асабістых спаборніцтвах перамаглі Алена Лісаевіч (2 курс) — 100м батэрфляем, трэцякурснік Уладзімір Катлоўскі — 200м вольным стылем. Ён праплыў дыстанцыю за 1.56,0 сек., што на 2,0 сек. вышэй нормы майстра спорту Рэспублікі Беларусь.

У жаночай эстафеце 4x100м вольным стылем і 4x100м у камбінаваным плаванні нашы каманды былі першымі, а ў эстафеце 4x200м вольным стылем — другімі.

***

У Гродне прайшлі фінальныя гульні рэспубліканскіх спаборніцтваў па гандболу сярод жаночых каманд у праграме круглагадовай спартакіяды вну.

Нашы гандбалісткі пад кіраўніцтвам заслужанага трэнера Беларусі Валерыя Крукоўскага не пакінулі шансаў на перамогу ніводнай камандзе і ўзняліся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару.

**В.МАРЧАНКА.**

## СТАРТАВАЎ ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ СЕЗОН

У горадзе-герої Брэсце прайшоў вясенні лёгкаатлетычны крос у праграме рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў. У ім з вялікай цяжкасцю (па фінансавых прычынах) прыняла ўдзел зборная каманда нашага універсітэта, у састаў якой уваходзілі студэнты розных курсаў факультэта фізічнай культуры і спорту.

Каманда ГДУ заняла 4-е агульнакаманднае месца, але ў цэлым паказала дастаткова высокі вынік, набраўшы 140 ачкоў у агульным заліку.Яна ўступіла камандам Акадэміі фізічнага выхавання і спорту, Брэсцкага і Гродзенскага дзяржуніверсітэтаў. Дадзенае яе становішча не адлюстроўвае сапраўдных суадносін сіл, бо вышэйназваныя каманды аказаліся наперадзе нас не за кошт непасрэднага выступлення ў кросе ўдзельнікаў каманд, а ў выніку так званага перазаліку, што, на наш погляд, у дадзенай сітуацыі было несправядліва.

Трэба адзначыць, што сярод удзельнікаў каманды нашага універсітэта — 2 пераможцы: Аляксандр Фешчанок (1000 м — 2.42,3) і Крысціна Кірава (3000 м — 10.58,8), адзін прызёр Аляксей Гаўрычэнка (8000 м — 27.16,7).

У камандную капілку прынеслі ачкі Віталь Чахоўскі, Стэла Ярчак, Аляксандр Анонічаў, Аляксандр Дзьякаў.

У падрыхтоўцы каманды прынялі ўдзел трэнеры-выкладчыкі кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту Ю.І.Сакалоў, У.С.Лемяшкоў і заг.кафедры АЛФК Г.І.Нарскін.

**М.КАНЯХІН,**
**заг.кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту.**

---

**Для любителей шахмат**

## МАТЧ ПО ПЕРЕПИСКЕ

В Аргентине шахматы преподают в школах и даже в университетах, по всей стране существуют многочисленные шахматные клубы и центры шахматной культуры, издается несколько специализированных журналов.

В сентябре прошлого года стартовал шахматный матч (по переписке) Беларусь — Аргентина (LADAC). В командах — по 12 шахматистов высокой квалификации, каждый играет с партнером две партии, одну белыми, вторую — черными (максимальный срок матча 50 месяцев). Капитан команды Аргентины доктор Эктор Рикардо Забала (он обладает званием международного мастера (ICCF) считает, что этот матч по переписке имеет историческое значение. В Аргентине он вызвал огромный общественный интерес, и аргентинские шахматисты очень серьезно отнеслись к предстоящей встрече. Для гомельчан интересен такой факт. В команде республики из 12 участников пять человек представляют Гомельщину: Олег Федорцов, Сергей Проничкин, Иван Сквира, Владимир Исаенко, автор этих строк (он избран капитаном команды).

Начало матча с Аргентиной сложилось неудачно для команды Беларуси: с черными фигурами проиграл свою партию, сыгранную по E-mail, опытный мастер минчанин Вадим Пономаренко, и счет пока стал (1 — 0) в пользу аргентинской команды. (Из 24 партий лишь две разыгрываются по E-mail, остальные по обычной почте).

Предлагается шахматная двухходовка А.Савёнка: начинают белые и мат в два хода. Попробуйте решить.

Белые: Крg8, Фf3, Cd4, п. c2 (4).

Черные: Крa5, п. a4 (2).




Мат в 2 хода.

**А.САВЁНОК,**
**кандидат физико-математических наук,**
**master (ICCF).**



МАЙСКІ ПЕЙЗАЖ.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры АЛФК выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыцы **БАНДАРЭНКА** Але Яўгенаўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БАЦЬКІ**.

Дэканат матэматычнага факультэта, калектыў кафедры матаналізу выказваюць глыбокае спачуванне лабаранту кафедры **ЕЎДАКІМОВІЧ** Ганне Васільеўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **МАЦІ**.


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 242
Падпісана да друку 28.04.2000 г.